Нацыянальная бібліятэка перадала 200 кніг зале ведаў Цэнтра народнай дыпламатыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ва Узбекістане. «У рамках праекта "Беларусь сёння" мы перадаём Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва 200 кніг аб прыродзе, архітэктуры Беларусі, аб нашых дзеячах культуры і мастацтва, а таксама мастацкія творы як класікаў беларускай літаратуры, так і сучасных пісьменнікаў. Сёлета мы ўжо перадалі камплекты кніг Турцыі і Стамбульскаму ўніверсітэту, а таксама Пярмі», — расказала генеральны дырэктар НББ Аксана Кніжнікава. Пасольства Узбекістана ў Беларусі таксама перадало Нацыянальнай бібліятэцы калекцыю з 24 плакатаў дзеячаў узбекскай культуры, а таксама збор з 50 выданняў мастацкай прозы і паэзіі класікаў Узбекістана, якія паказваюць традыцыі, лад жыцця і побыт народа.